PolotskSU



**УДК 947. 6 (05)**

# ПРАВЯДЗЕННЕ НАЦЫСЦКАЙ ПАЛІТЫКІ ІЗАЛЯЦЫІ ЯЎРЭЙСКАГА НАСЕЛЬНІЦТВА І СТВАРЭННЕ ГЕТА НА ТЭРЫТОРЫІ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ Ў 1941 – 1942 ГАДАХ

***А.І. КОРСАК***
***(Віцебскі дзяржаўны універсітэт ім. П.М. Машэрава)***

*Нягледзячы на наяўнасць значнай колькасці прац, у якіх закранаюлася праблема Халакоста, застаецца шмат звязаных з ёю маладаследаваных і недаследаваных праблем, таму ў дадзеным артыкуле аб'ектам даследавання з'яўляецца правядзенне нацысцкай Германіяй палітыкі ізаляцыі яўрэйскага насельніцтва і стварэнне гета на тэрыторыі Віцебскай вобласці ў 1941 – 1942 гадах. У працы вырашаюцца наступныя задачы: па-першае, паказаны меры, якія прадпрымаліся нямецка-фашысцкімі акупантамі дзеля пазбаўлення асоб яўрэйскай нацыянальнасці палітычных і эканамічных праў; па-другое, разглядаецца працэс паступовага ізалявання ад іншага насельніцтва і стварэння гета – канцэнтрацыйнага лагера «адкрытага» і «закрытага» тыпу для размяшчэння яўрэйскага насельніцтва – на прыкладзе тэрыторыі Віцебскай вобласці. Асобая ўвага ўдзяляецца пытанню ўнутранага самакіравання ў гета – арганізацыі яўрэйскага савета (юдэнрата) і паліцыі, якія знаходзіліся пад назіраннем гебітскамісара ці асобы, назначанай ім. Вызначаюцца асобныя рысы ў працэсе стварэння гета ва ўсходніх і заходніх раёнах Віцебскай вобласці, якія пад час акупацыі знаходзіліся ў розных тэрытарыяльных межах, што і сказалася на працэсе адасаблення асоб яўрэйскай нацыянальнасці ад мясцовага неяўрэйскага насельніцтва.*

## Уводзіны

Да канца жніўня 1941 года Беларусь была поўнасцю акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. На тэрыторыі рэспублікі пачалося ўсталяванне жорсткага акупацыйнага рэжыму.

Трагедыя яўрэйскага насельніцтва ў гады Вялікай Айчыннай вайны была часткай трагедыі ўсіх жыхароў Беларусі, лёс якога вырашаўся згодна з уключэннем тэрыторыі рэспублікі ў сферу жыццёвай прасторы Германіі паводле распрацаванага плана «Ост» – плана каланізацыі і германізацыі Усходняй Еўропы.

Акупацыйная палітыка германскіх улад – гэта палітыка знішчэння асобных груп насельніцтва захопленых тэрыторый паводле расавых, нацыянальных, палітычных, рэлігійных поглядаў. Адны народы нацысты мелі намер знішчыць поўнасцю, другія – біялагічна аслабіць, трэція – анямечыць.

У Беларусі, якая найбольш пацярпела ў гады вайны сярод іншых рэспублік СССР, палітыка знішчэння мірных жыхароў была распрацавана даволі падрабязна, але пры гэтым не было прынятым больш дэталёва гаварыць пра ахвяры сярод яўрэйскага насельніцтва.

## Асноўная частка

Непасрэднае ажыццяўленне распрацаванай праграмы ўсходняй акупацыйнай палітыкі першапачаткова ўскладвалася на органы ваенна-акупацыйнай адміністрацыі. У красавіку 1941 года было створана Цэнтральнае бюро па падрыхтоўцы вырашэння пытання аб «усходняй прасторы» пад кіраўніцтвам партыйнага ідэолага А. Розенберга, які лічыўся спецыялістам па Расіі. Сістэма нямецка-фашысцкага рэжыму на акупіраваных тэрыторыях канчаткова атрымала афармленне на нарадзе 16 ліпеня 1941 годзе ў стаўцы А. Гітлера, дзе было яшчэ раз пацверджана, што галоўнай мэтай вайны з'яўляецца захоп і расчляненне тэрыторыі СССР, выкарыстанне яе нацыянальных багаццяў. На нарадзе была зацверджана структура ваенна-паліцэйскіх і грамадзянскіх акупацыйных улад, вызначаны метады кіравання захопленнымі землямі, кандыдатуры іх кіраўнікоў. У адпаведнасці з распараджэннем А. Гітлера было створана імперскае Міністэрства па справах акупіраваных абласцей («Усходняе міністэрства») пад падначаленнем А. Розэнберга.

Пасля апрабацыі «канчатковага вырашэння» яўрэйскага пытання на тэрыторыі Германіі, затым Польшчы, нямецка-фашысцкія акупанты перанеслі сваю тактыку знішчэння яўрэяў і на Беларусь, у тым ліку на Віцебскую вобласць.

Паводле адміністрацыйнага распараджэння № 1 камандуючага тылам групы армій «Цэнтр» генерала пяхоты фон Шэнкендорфа ад 7 ліпеня 1941 года ўводзіліся адметныя знакі для яўрэйскага насельніцтва:

«1. Усе яўрэі і яўрэйкі, якія знаходзяцца на занятай рускай тэрыторыі і дасягнуўшыя 10-гадовага ўзросту, неадкладна абавязаны насіць на правым рукаве верхняга адзення і сукенкі белую паласу шырынёй да 10 см з намаляванай на ёй сіяніскай зоркай або жоўтую павязку шырынёй да 10 см.

2. Такімі павязкамі забяспечваюць сябе самі яўрэі і яўрэйкі.

3. Яўрэям катэгарычна забараняецца вітаць» [1].

Акрамя ўжо існуючых правіл паводзін паводле дырэктывы Г. Лозэ ад 13 жніўня 1941 года яўрэям забаранялася: выязжаць з мясцовасці або мяняць месца жыхарства без належнага дазволу гебітскамісара ці штадскамісара; карыстацца тратуарамі, грамадскім транспартам, месцамі і ўстановамі адпачынку, наведваць тэатры, кінатэатры, бібліятэкі, музеі, школы; валодаць аўтамашынамі і радыёпрыёмнікамі і г.д. [2, с. 54].

PolotskSU



У сувязі з загадам гебітскамісара ад 24 лютага 1942 года строга забаранялася прымаць і лячыць хворых яўрэяў у амбулаторыях і бальніцах [3, с. 8]. Урачам з ліку асоб яўрэйскай нацыянальнасці дазвалялася лячыць ці кансульціраваць толькі яўрэйскіх пацыентаў.

У выпадку невыканання ўсіх загадаў і распараджэнняў яўрэйскае насельніцтва каралася смерцю.

Канцэнтрацыйныя лагеры былі асноўным сродкам правядзення палітыкі генацыду. Нягледзячы на тое, што прымусовае ўтрыманне яўрэяў ідэалагічна тлумачылася небяспечнасцю іх уплыву на мясцовае насельніцтва, на самой справе нацысты прадугледжвалі гэтым некалькі мэт: аблягчэнне далейшай ліквідацыі яўрэяў; прадухіленне іх супраціўлення, што згодна небеспадстаўнай асцярогі нацыстаў мела месца атрыманне бясплатнай працоўнай сілы. Адкрытыя формы масавага знішчэння яўрэйскага насельніцтва маглі выклікаць адпаведную рэакцыю як у самой Германіі, так і ў сусветнай грамадскасці [4, с. 18].

З зводкі падзей у СССР паліцыі бяспекі і СД № 31, датаванай 23 ліпенем 1941 года, вынікае: «Першапачатковай і цяжкавырашаемай праблемай, у сувязі з вялікай колькасцю яўрэяў, з'яўляецца іх размяшчэнне ў гета. Гэта праца ўжо праводзіцца. Сумесна з палявымі і мясцовымі камендатурамі ўжо падабраныя прыдатныя для гэтых мэт гарадскія кварталы» [5].

13 жніўня 1941 года паводле дырэктывы рэйхскамісара Остланда Г. Лозэ ва ўсіх тылавых раёнах армій і груп армій быў аддадзены загад аб неабходнасці стварэння гета [6, с. 147].

Кіраванне гета ажыццяўлялі нямецкія каменданты – начальнікі гета. Да функцый кіравання адносіліся меры па падтрыманні ўнутранага парадку і захаванні дзеяздольнасці працоўных атрадаў. Ажыццяўленне захавання бяспекі з'яўлялася задачай СС і паліцыі.

Акупацыйныя ўлады імкнуліся атрымаць ад гета ўсё неабходнае для вермахта, гестапа і свайго абагачэння праз арганізацыю адміністрацыйных форм кіравання ўнутры канцэнтрацыйнага лагера. Дзеля гэтага пры каменданце гета ствараліся юдэнраты і яўрэйская паліцыя. Стварэнне юдэнратаў вызначалася дырэктывай Р. Гейдрыха 1939 года па пытанню абыходжання з яўрэйскім насельніцтвам [7, с. 33]. У чэрвені 1941 года нямецка-фашысцкія акупанты даносілі ў Берлін: «Ва ўсіх гарадах Беларусі прызначаныя ўпаўнаважаныя прадстаўнікі з ліку яўрэйскага насельніцтва, якім было даручана стварэнне яўрэйскага савета. Гэты яўрэйскі савет поўнасцю нясе адказнасць за паводзіны яўрэйскага насельніцтва і выканання ім усіх распараджэнняў нямецкіх улад» [8, с. 49].

Юдэнрат («яўрэйскі савет», – нем.) – орган, уведзены нямецка-фашысцкімі акупацыйнымі ўладамі для кіравання яўрэйскім насельніцтвам асобных гарадоў і мястэчак, які складаўся з прызначаных уладамі яўрэяў і нёс адказнасць за выкананне нацыскіх загадаў, што датычыліся яўрэяў. Пасля стварэння гета юдэнрат адказваў за ўсё, што адбывалася ўнутры яго. Ён хутка прыдбаў галоўную ролю і кантраляваў яўрэйскую паліцыю, пажарную частку, гаспадарчую дзейнасць, забеспячэнне харчаваннем, ахову здароўя, сацыяльныя службы [6, с. 80]. Нацысты выкарыстоўвалі асаблівасці сацыяльнай арганізацыі і псіхалогію яўрэйскага насельніцтва для таго, каб звесці да мінімума магчымасці супраціўлення. Вельмі часта яўрэйскі савет ствараўся яшчэ да таго, калі выносіўся загад пра ўтварэння гета.

Стварэнне гета з апорай на юдэнраты не адзначала адказ нацыстаў ад палітыкі татальнага знішчэння яўрэйскага насельніцтва. Ствараючы бачнасць упарадкаванага жыцця ў гета, немцы стараліся падтрымліваць у асуджаных на смерць яўрэяў надзею на выратаванне.

Становішча яўрэйскага савета было дваістым. З аднаго боку, ён павінен быў супрацоўнічаць з акупацыйнымі ўладамі, а з другога – захаваць жыццё «ворагаў рэйха» – вязняў гета. Аднак лёс вырашаўся далёка не юдэнратам, а камандаваннем айнзацгруп.

Амаль адначасова з стварэннем юдэнрата была арганізавана яўрэйская служба парадку. Яўрэйская паліцыя ўтваралася яўрэйскім саветам з ліку вязняў гета з мэтай падтрымкі ўнутранага парадку на тэрыторыі канцэнтрацыйнага лагера. Ёй дазвалялася мець некаторую амуніцыю, якая абмяжоўвалася толькі гумовымі дубінкамі ці палкамі. У якасці знака адрознення павінны насіць на правым рукаве павязку белага колеру з жоўтай яўрэйскай зоркай [2, с.55].

Гета называлі частку тэрыторыі горада, вылучаную ў сярэднія вякі ў краінах Заходняй і Цэнтральнай Еўропы для ізаляванага жыцця яўрэяў. У часы другой сусветнай вайны гета – гэта гарадскія канцэнтрацыйныя лагеры, якія ствараліся нямецкімі захопнікамі на акупіраванай тэрыторыі з мэтай ізаляцыі і наступнага знішчэння яўрэйскага насельніцтва [9, с. 165].

На тэрыторыі Віцебскай вобласці, як і наогул на Беларусі, гета стваралісі «адкрытага» і «закрытага» тыпу. «Адкрытыя» гета ўзнікалі ў мястэчках са значнай колькасцю яўрэйскага насельніцтва, дзе яго высяляць і затым ахоўваць было немэтазгодна. «Адкрытае» гета насіла часовы характар – да знішчэння або перасялення ў «закрытае» гета. Між тым для акупацыйных улад вырашальным фактарам стварэння гета закрытага тыпу была задача паэтапнага, паслядоўнага ажыццяўлення «канчатковага рашэння» яўрэйскага пытання.

Аднак стварэнне «закрытага» гета было абумоўлена і эканамічным фактарам. Па-першае, узмацненне жорсткасці кантролю за забеспячэннем бясплатнай працоўнай сілы як унутры, так і за межамі гета. Па-другое, павелічэннем працягласці працоўнага дня з прычыны скарачэння часу на дастаўку вязняў да месца працы.

PolotskSU



Стварэннем «закрытых» гета меркавалася перасяленне ўсіх яўрэяў у вызначанае месца: квартал, вуліцу ці дом (памяшканне). Тэрмін перасялення, як правіла, устанаўліваўся ў некалькі дзён (Віцебскае гета). Іншы раз перасяленне расцягвалася на больш доўгі тэрмін. Знешняй прыметай «закрытага» гета была агароджа, якая ўстанаўлівалася сіламі саміх яўрэяў і за іх кошт, з калючага дроту ці драўляная. Уваход і выхад з гета мог ажыццяўляцца толькі праз адзін ці некалькі прапускных пунктаў, якія ахоўваліся з знешняга і ўнутранага бакоў.

Як правіла, перасяленню ў гета папярэднічалі тыя прэвентыўныя меры ізаляцыі яўрэйскага насельніцтва, якія адпавядалі «адкрытаму» тыпу гета. У шэрагу выпадкаў гэтыя працэсы праходзілі паралельна. Як ужо адзначалася, яўрэйскія кварталы ствараліся звычайна на ўскраінах населенага пункту ці ў самых непрыгодных для жыцця раёнах, вуліцах ці памяшканнях. Гета магло мець двайную ахову: яўрэйскую «службу парадку» ўнутры і мясцовую паліцыю па другі бок гета. У зоне ваеннай адміністрацыі ахову гета звычайна неслі толькі мясцовыя паліцэйскія. Стварэнне такога тыпу гета азначала поўную фізічную ізаляванасць яўрэйскага насельніцтва. Яно адрознівалася ад працоўнага лагеру перш за ўсё магчымасцю пражываць разам са сваімі родзічамі і наяўнасцю часткі асабістай маёмасці.

Аб’ектыўна перасяленне ў «закрытае» гета вызначала важны крок да стварэння ўмоў фізічнага вымірання недзеяздольнага яўрэйскага насельніцтва, бо яно пазбаўлялася ўсіх сродкаў для існавання і ізалявалася ад знешняга свету. Без дапамогі мясцовага насельніцтва як бескарыслівага, перш за ўсё родзічаў, сяброў, суседзяў, так і заснаванага на матэрыяльным фактары – продаж па завышанаму кошту і абмен прадуктаў харчавання на каштоўныя рэчы і адзенне – вязні былі асуджаны на гібель у кароткі тэрмін.

Стварыўшы канцэнтрацыйныя лагеры для асоб яўрэйскай нацыянальнасці, улады абязалі вязняў знаходзіцца толькі ў межах тэрыторыі, абазначанай у загадах палявых і мясцовых камендатур: «Трэба наглядаць самым строгім чынам, каб ніякія мясцовыя ўлады не мелі права выдаваць жыдам якіх-небудзь прапускоў і тым самым пашырыць межы іх свабоды. Прапускі могуць выстаўляцца толькі ў важных выпадках. Яны дазваляюць уладальніку такога дазволу аддаляцца ад гета да аднаго кіламетра» [10]. Выхад з гета забараняўся пад пагрозай расстрэлу.

Ва ўсіх створаных канцэнтрацыйных лагерах для яўрэйскага насельніцтва ўмовы жыцця былі складанымі. Абавязковымі былі прымусовыя работы. Працавалі па 14 – 16 гадзін у суткі. За невыкананне загадаў прымяняліся розныя віды пакаранняў [11, с. 23 – 25].

Вязням у гета было наканавана паўгалоднае існаванне. Тым, хто працаваў, давалі харчоў у два разы менш, чым гэтага патрабуе самая ніжэйшая норма. У Глыбоцкім гета, напрыклад, на аднаго працуючага давалі 330 г хлеба, 80 г мяса і 50 г круп на тыдзень [11, с. 24]. Тыя, хто не працаваў, а гэта – старыя людзі і дзеці, перабіваліся хто чым мог: варылі крапіву, траву, а калі перападалі бульбяныя лупіны, то гэта лічылася вялікім шчасцем.

Зняволенне яўрэйскага насельніцтва ў месцы прымусовага ўтрымання на тэрыторыі Віцебскай вобласці было этапам агульнай палітыкі іх запланаванага татальнага знішчэння.

На Віцебшчыне канцэнтрацыйныя лагеры для асоб яўрэйскай нацыянальнасці пачалі ствараюцца ў ліпені – жніўні 1941 года адразу пасля акупацыі тэрыторыі, пераважна ў буйных гарадах: Віцебску (ліпень 1941 г.) [12, с. 439]; Полацку (жнівень 1941 г.) [13, с. 415]; Оршы (верасень 1941 г.) [14], а затым у астатніх раённых цэнтрах і мястэчках. Асабліва актыўна гэты працэс праходзіў на тэрыторыі, якая падпарадкоўвалася камандванню зоны тылу групы армій «Цэнтр». Звязана гэта з тым, што ўсходнія раёны Віцебскай вобласці складалі прыфрантавы тыл вермахта, бяспека якога дасягалася шляхам знішчэння «непажаданых элементаў».

У першыя дні акупацыі Віцебска па загаду нямецкага камандавання была праведзена рэгістрацыя яўрэяў. У спісы было занесена 16 тысяч чалавек у тым ліку і дзеці ад змешаных шлюбаў у другім і трэцім пакаленні [12, с. 439]. Цалкам магчыма, што на гэту рэгістрацыю з’явіліся далёка не ўсе, так як частка яўрэйскіх сем’яў, якія зрабілі спробу эвакуіравацца, і ім гэта не ўдалося, вярталася назад. Разам з імі ў Віцебску аказаліся і бежанцы з заходніх раёнаў Беларусі, якія таксама не паспелі пакінуць акупіраваную тэрыторыю. Таму магчыма, што ў Віцебску аказалася ў першыя тыдні акупацыі значна больш яўрэйскага насельніцтва, чым пражывала да вайны.

25 ліпеня 1941 года ў межах цяперашніх вуліц Энгельса, Камсамольскай і Кірава было створана гета, пераправа ў якое, як аказалася, была задумана фашыстамі як яшчэ адна расправа над мірным насельніцтвам. Былы бургамістр горада Віцебска В. Родзька падчас допытаў у жніўні 1945 года паказаў: «У падборы месца для гета і высялення яўрэйскага насельніцтва з кватэр прынялі актыўны ўдзел Л.Р. Брандт, а ў расстрэле – мясцовая паліцыя, на чале якой стаялі П. Шостак і А. Туроўскі». Месца, адведзенае для гета, уяўляла сабой каменнае папялішча, дзе ніхто ўжо не жыў. Яўрэям прыходзілася туліцца пад навесамі. Тысячы хаваліся ў невялікім будынку былога клубу Металістаў. Па ўспамінах былога вязня гета Х. Партнога, людзі размяшчаліся на лесвічных пляцоўках, сотні набіліся на балконы, быў заняты кожны сантыметр на падлозе. Астатнія, а іх была большая частка, засталіся пад адкрытым небам на беразе ракі, у дворышчах разбураных памяшканняў. Пасля таго як усіх яўрэяў перасялілі ў гета, яго тэрыторыя была абнесена высокай дашчатай агароджай і калючым дротам. Днём і ўначы яно ахоўвалася паліцыяй. Выходзіць з гета мелі права толькі тыя мужчыны, якіх ганялі пад канвоем на працы. 16 верасня 1941 года мяс-

PolotskSU



цовая прафашысцкая газета «Витебские ведомости» надрукавала аб'яву: «Усім грамадзянам нежыдоўскага паходжання сурова забараняецца знаходжанне на тэрыторыі гета. Адначасова ўсім жыдам забараняецца хаджэнне на няўказаннай ім тэрыторыі. За парушэнне вінаватыя будуць пакараны. Крымінальны аддзел горада Віцебска» [12, с. 440 – 442].

Так, на працягу некалькі дзён, 25 – 27 ліпеня, было ўтворана Віцебскае гета, дзе ўтрымлівалася каля 20 тысяч чалавек [15, с. 149].

Не менш у жудасным становішчы апынуліся яўрэі Полацкага гета, якое было створана праз дватры тыдні пасля акупацыі горада. Усіх яўрэяў перасялілі ў раён вуліц Камуністычнай, Гогалеўскай, Войкаўскай, Інтэрнацыянальнай (былая Яўрэйская). На тэрыторыі гета знаходзіліся амбулаторыя, лазневапральны камбінат, электрастанцыя, школа № 12, сінагога, пошта. Гета было абнесена калючым дротам. З боку вуліцы Гогалеўскай быў надпіс «Гета». Тут жа вісеў плакат: «Кожны заўважаны на тэрыторыі лагера «Гета» рускі будзе пакараны» [13, с. 415]. У гета знаходзілася каля 5 тысяч чалавек. Шмат дамоў у ім было разбурана. Людзі існавалі ў страшэннай цеснаце. У кожным доме знаходзіліся па 10 – 15 сямей. За межы гета забаранялася выходзіць. Усіх вязняў ганялі на работы. У верасні 1941 года гета перамясцілі на ўскраіну горада, у раён в. Лазоўка, непадалёку ад ваенных гарадкоў Баравуха-2 і Баравуха-3, тут ужо размяшчалася каля 8 тысяч чалавек [16]. Гэта было абумоўлена тым, што сюды далучылі яўрэяў з навакольных вёсак. Усіх пасялілі ў 10 бараках. Тэрыторыя таксама была агароджана калючым дротам і ахоўвалася паліцаямі. Немцы прыязджалі толькі рабаваць – усіх выганялі на вуліцу, загадвалі распранацца, потым абшуквалі, забіралі ўсе каштоўныя рэчы і золата. Рэжым у гета быў падпарадкаваны мэтам масавага знішчэння яўрэяў. Ежа выдавалася адзін раз у суткі, гэта была мучная баланда без солі і 100 г хлеба, прыгатаванага з сумесі здробненага пілавання са жмыхам. Вады не давалі зусім. Тых, хто не меў сілы для працы, расстрэльвалі або збівалі да паўсмерці. Ствараліся ўмовы для распаўсюджвання інфекцыйных захворванняў. Людзі сотнямі паміралі ад голаду, холаду і захворванняў. Жыхарка горада Полацка А. Баўтрукова паведаміла: «На маіх вачах былі вывезены з лагера і пахаваны на Старасвецкіх могілках больш за 500 трупаў» [13, с. 411].

Гета ў Оршы было ўтворана ў верасні 1941 года, дзе на пачатку ўтрымлівалася каля 1750 чалавек [14]. Яно размяшчалася ад вуліцы Народнай да польскага могільніка, уся вуліца Энгельса, уключаючы тэрыторыю завода Славінскага. Мясцовасць падбіралі спецыяльна, каб было лягчэй сачыць за вязнямі і каб можна было агарадзіць калючым дротам. Быў створаны юдэнрат, старшынёй назначылі Каждана, які да вайны працаваў галоўным бугалтэрам «Саюззаготкож» і «Саюзпушніна».

Прыкладна ў гэты ж час, канец лета – пачатак восені 1941 года, былі ўтвораны гета ў іншых раённых цэнтрах у межах дзеянняў групы армій «Цэнтр»: Шуміліна (жнівень 1941 г.); Гарадок (жнівень 1941 г.), Талачын (верасень – кастрычнік 1941 г.); Расоны (верасень – кастрычнік 1941 г.); Чашнікі (канец 1941 г.); Ушачы (кастрычнік 1941 г.); Верхнядвінск (восень 1941 г.); Бешанковічы (канец 1941 г.), Лепель, Сянно і інш.

Цікава тое, што мясцовае яўрэйскае насельніцтва ведала пра масавыя расстрэлы, бо сюды, як згадвалася раней, сцякаліся яўрэі, якім пашчасціла пазбегнуць смерці. У вязняў была магчымасць збегчы, бо ўтворанае гета не ахоўвалася, а толькі было абнесена калючым дротам. Аднак большая частка засталася на сваіх месцах. Бегчы асабліва не было куды, бо стырмлівала марозная зіма, а ў большасці – адсутнасць партызанскіх атрадаў, якія з'явіліся толькі вясной – летам 1942 года.

Такім чынам, на ўсходняй тэрыторыі Віцебскай вобласці, якая знаходзілася ў межах дзеянняў зоны тылу групы армій «Цэнтр», большасць гета закрытага тыпу былі ўтвораны за першыя тры месяцы акупацыі (ліпень – верасень 1941 г.).

Па адміністрацыйнаму падзелу заходнія раёны Віцебскай вобласці былі аб'яднаны ў Глыбоцкую акругу (гебіт), якая ўваходзіла ў склад генеральнай акругі Беларусь. Для больш «інтэнсіўнай эксплуатацыі Глыбоцкая акруга была падзелена на 9 раёнаў: Глыбоцкі, Дунілавіцкі, Пастаўскі, Браслаўскі, Дзісненскі, Мёрскі, Пліскі, Шаркаўшчынскі і Докшыцкі [17].

Цэнтрам гебіта быў прызначаны горад Глыбокае на чале з гебітскамісарам Паулем Гахманам. Тут знаходзіўся штаб 391-й дывізіі пад камандаваннем генерал-лейтэнанта барона фон Мантэйна, якой было даручана весці ахову канцэнтрацыйных лагераў, у тым ліку і для асоб яўрэйскай нацыянальнаці, размешчаных на тэрыторыі акругі.

Глыбоцкае гета было адным з самых буйных і па памерах, і па колькасці вязняў, і па тэрміну існавання.

Першыя пару месяцаў яўрэі горада Глыбокае працягвалі жыць на сваіх старых месцах. 22 кастрычніка 1941 года па загаду гебітскамісара П. Гахмана ўсе глыбоцкія яўрэі на працягу гадзіны павінны былі сабрацца ў гета [18]. Нельга было забіраць з сабой рэчы, толькі некаторыя дробязі, і то з дазволу спецыяльна прызначанай камісіі з магістрату. Пад гета акупанты вызначылі тэрыторыю ў межах цяперашніх вуліц Друйскай, Энгельса, Чырвонаармейскай, Чырвонага Партызана, часткова вуліцы Маркса. Ад астатніх раёнаў горада гета было ізалявана драўляным плотам з калючым дротам. Папасці ў яўрэйскі лагер можна было толькі праз адзіныя вароты.

Да лістапада 1941 года ў Глыбоцкім гета, куды пазней размясцілі яўрэяў з іншых гарадоў і мястэчак акругі, знаходзілася больш 5800 чалавек [17, с. 72].

PolotskSU



У данясенні ў Цэнтральны штаб партызанскага руху, накіраваным камандаваннем 1-й партызанскай брыгады імя Суворава, дзе камандзірам з’яўляўся П.А. Хомчанка, паведамлялася: «Знаходзячымся ў канцлагеры былі створаны жудасныя ўмовы існавання: мардаваныя непасільнымі ўмовамі працы: дастаўлялі бярвенне на плячах да трох кіламетраў, падносілі каменне і цэглу ўручную да 30 – 50 кг на аднаго працоўнага, выпілоўвалі кавалкі ільду босымі, распранутымі і дастаўлялі іх без усялякіх падручных сродкаў перавозкі, малолі зерне ўручную на паравой мельніцы, рухавік якой не працаваў, адкачвалі ваду пры дапамозе прывада, куды павінны былі запрагацца коні, падносілі пясок і гравій для рамонту дарог, стваралі спецыяльныя збруі для перавозу на 1 – 1,5 км 5 – 10 бярвенняў жылых дамоў, выкарыстоўвалі яўрэяў для вынасу неразарваўшыхся авіябомб без усялякіх інструментаў, пасля чаго гэта ўсё фатаграфавалася...» [19].

На працягу ўсяго існавання гета немцы некалькі разоў аблагалі яго вязняў кантрыбуцыяй. Усё што збіралася, – адзенне, рэчы, посуд, каштоўнасці і залатыя грошы – перадавалася гебітскамісару П. Гахману. Калі умовы кантрыбуцыі не выконваліся, расстрэльвалі па некалькі сот чалавек.

У Глыбокім, як і ў многіх іншых месцах, акупанты выкарыстоўвалі правакацыйныя метады для атрымання ад яўрэйскага насельніцтва каштоўных рэчаў і палёгкі пад час знішчэння – раздзяленне гета на дзве часткі. У другое гета, па словах нямецка-фашысцкіх акупантаў, павінны ўвайсці «малакарысныя», «малакаштоўныя» яўрэі. На самой справе ў гэтае гета пападала шмат спецыялістаў: рамеснікі, цесляры і інш. Немцы вырашылі выкарыстаць гета для грашовай «акцыі»; ад другога гета можна было адкупіцца. Такім чынам, яўрэі, якія ўносілі за сябе выкуп, заставаліся ў першым гета. Людзі, якія не маглі ўнесці грошы, павінны былі перавесціся ў другое гета, хоць сярод іх было шмат спецыялістаў. Перамяшчэнне ў другое гета працягвалася каля двух тыдняў, ад 20 мая да першых дзён чэрвеня 1942 года. М. Раяк успамінае: «Бедныя старыя людзі плакалі і рыдалі, пытаючыся: «Куды і навошта нас вязуць? За якія грахі нас аддзяляюць ад нашых дзяцей і ўнукаў?» [20, с. 233].

Пасля ўтварэння другога гета акупанты аб’явілі, што ўсе жыхары першага гета атрымаюць працоўныя пасведчанні як спецыялісты, што гарантуе ім недатыкальнасць.

У час акупацыі на тэрыторыі Браслаўскага раёна было ўтворана некалькі гета: у Браславе (5 тыс. чал.) [21, с. 150]; Друі (700 чал.); Опсе (300 чал.).

Адразу пасля акупацыі горада Браслава гітлераўцы сабралі ўсё яўрэйскае насельніцтва на рыначнай плошчы. Падзялілі мужчын, жанчын, дзяцей і потым пагналі да багністага берага возера каля вескі Дубкі. Там, пад аховай, пратрымалі ўсю ноч. Пры спробе ўцячы было забіта два чалавекі, якія і сталі тут першымі ахвярамі нацыстаў. Як сведчаць відавочцы Р. Мілюцін, Ф.Токар, «усіх апанаваў страх, было перакананне, што гэта канец. Аднак нечакана, раніцай, усім дазволілі вярнуцца ў горад. Забітыя горам, спакутаваныя і знясіленыя, з плачучымі дзецьмі на руках ледзьве дабраліся да сваіх хат і ўбачылі жахлівую карціну пагрому. Хаты былі дашчэнту разрабаваны». У склад яўрэйскага савета Браслаўскага гета ўвайшлі: старшыня Іцхак Мендэль, сакратар Хаім Муніц, члены Гершэн Кленэр, настаўнік Элізер Мазо, Рафаэль Лейб Волін і інш. – усяго 14 чалавек. Паліцэйскімі былі прызначаны А. Арлюк, Лейб Волін і інш. [22, с. 382]. У першыя дні красавіка 1942 года гестапа перадала праз юдэнрат загад усім яўрэям Браслава перабрацца ў хаты па вуліцы Ленінскай. Больш зручнае месца для гета было цяжка ўявіць – з аднаго боку вуліцу абмяжоўвала возера, а з другога – Замкавая Гара. На тэрыторыі гета панавала жахлівая цесната, жылі па некалькі сем’яў у адной кватэры. Некаторыя не вытрымлівалі і паміралі ад хвароб. З ліку мясцовага насельніцтва знаходзіліся і такія, хто няблага пажывіўся на пакутах яўрэяў, якія згодны былі за кавалак хлеба аддаць любыя рэчы, мэблю, каштоўнасці, што яшчэ засталося пасля пагромаў [22, с. 383].

На тэрыторыі Пастаўскага раёна ў час Вялікай Айчыннай вайны былі ўтвораны два канцэнтрацыйныя лагеры для яўрэйскага насельніцтва: у Паставах (4 тыс. чал.) і ў мястэчку Дунілавічы (903 чал.) [23].

Згодна акту Камісіі па расследаванні злачынстваў нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Паставах ад 3 мая 1945 года: «У лютым месяцы 1942 года немцы ў Паставах арганізавалі для яўрэйскага насельніцтва спецыяльны лагер гета ў паўночнай частцы горада, якая займала тры вялікіх вуліцы, быў абнесены спецыяльнай агароджай і калючым дротам. Немцы ўтрымлівалі ў гэтым лагеры каля 4 тысяч чалавек да лістападу 1942 года. Шэф жандармерыі горада Паставы Шмідт, камендант паліцыі Кезік і іншыя пасобнікі глуміліся над вязнямі, марылі іх голадам, здзекваліся і забівалі без ніякай на гэта прычыны. На вачах мужоў і бацькоў гвалтавалі маладых жанчын і дзяўчат, пасля чаго забівалі» [24].

З прыходам нямецка-фашысцкіх акупантаў летам 1941 года на тэрыторыі Шаркаўшчынскага раёна былі ўтвораны гета ў Ёдах, Лужках, Германавічах і Шаркаўшчыне (лета 1941 г., колькасцю 1600 чал.) [25].

У верасні 1941 года быў выдадзены загад аб стварэнні гета ў Докшыцах, у якім за час існавання было знішчана 2653 чалавекі яўрэйскай нацыянальнасці [26, с. 295].

За перыяд з лета 1941 па красавік 1942 года на тэрыторыі Глыбоцкай акругі было арганізавана каля 19 канцэнтрацыйных лагераў для размяшчэння яўрэйскага насельніцтва. Самымі шматлікімі былі гета гарадоў Глыбокае (10 тыс. чал.), Браслаў (5 тыс. чал.), Паставы (4 тыс. чал.).

PolotskSU



**Высновы**

Пасля пачатку Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі Беларусі нямецка-фашысцкімі захопнікамі быў усталяваны жорсткі акупацыйны рэжым, накіраваны на пашырэнне жыццёвай прасторы для германскай нацыі. Для рэалізацыі сваіх мэт акупацыйныя ўлады спачатку паслядоўна пазбаўлялі яўрэйскае насельніцтва палітычных і эканамічных праў, а затым паводле распараджэнняў вышэйшага кіраўніцтва стваралі канцэнтрацыйныя лагеры «адкрытага» і «закрытага» тыпаў з арганізацыяй яўрэйскага савета і паліцыі.

На ўсходняй тэрыторыі Віцебскай вобласці, якая знаходзілася ў межах дзеянняў зоны тылу групы армій «Цэнтр», большасць гета былі ўтвораны за першыя тры месяцы акупацыі (ліпень – верасень 1941 г.). Па колькасці насельніцтва і месцы занімаемай плошчы буйнымі з'яўляліся гета ў Віцебску (20 тыс. чал.), Полацку (8 тыс. чал.), Оршы (6 тыс. чал.).

Што датычыцца заходніх раёнаў Віцебшчыны, якія складалі Глыбоцкі гебіт Генеральнай акругі «Беларусь», то гета «закрытага» тыпу для яўрэйскага насельніцтва ствараліся пазней – у асноўным пачынаючы з канца 1941 (Глыбокае, Докшыцы) да пачатаку 1942 года (Браслаў, Паставы). Да гэтага яўрэяў размяшчалі ў гета адкрытага тыпу, дзе была магчымасць пакідаць межы лагера для набыцця прадуктаў харчавання.

ЛІТАРАТУРА


1. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларуь (НАРБ). – Фонд 4683. – Воп. 3. – Спр. 952. – Л. 1, 2, 4 – 5.
2. Мюллер, Н. Вермахт и оккупация (1941 – 1944) / Н. Мюллер; пер. с нем. А. Артёмова [и др.]; под ред. А. Юденкова. – М.: Воениздат, 1974. – 387 с.
3. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці. – Фонд 2848. – Вып. 1. – Спр. 263.
4. Літвін, А.М. Нацысцкая палітыка генацыду і Беларусь: планы, вырашэнне, вынікі / А.М. Літвін // Генацыд у другой сусветнай вайне: праблемы даследавання (у памяць ахвяр Трасцянца): матэрыялы міжнар. навук. канф., Мінск, 25 – 27 красавіка 2002 г. / Адк. рэд. К.І. Козак, А.М. Літвін, У.Н. Сідарцоў. – Мінск: Выд. цэнтр БДУ, 2003. – 279 с.
5. НАРБ. – Фонд 510. – Воп. 1. – Спр. 71.
6. Иоффе, Э. К вопросу о «белых пятнах» в изучении Холокоста на территории Беларуси в годы Великой Отечественной войны / Э. Иоффе // Актуальные вопросы изучения Холокоста на территории Беларуси в годы немецко-фашистской оккупации: сб. науч. работ / сост. и ред. Я.З. Басин. – Минск, 2005. – 306 с.
7. Козак, К. Германский оккупационный режим в Беларуси и еврейское население / К. Козак // Актуальные вопросы изучения Холокоста на территории Беларуси в годы немецко-фашистской оккупации: сб. науч. работ / Сост. и ред. Я.З. Басин. – Минск: 2005. – 306 с.
8. Рывкин, М.С. Хроника страшных дней. Трагедия Витебского гетто / М.С. Рывкин, А.Л. Шульман. – Витебск: Витебская областная типография, 2004. – 152 с.
9. Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне, 1941 – 1945 // Беларус. Сав. Энцыкл.; рэдкал.: І.П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БелСЭ, 1990. – 680 с., (4)л. карт.: іл.
10. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці. – Фонд 2841. – Вып. 1. – Спр. 1.
11. НАРБ. – Фонд. 750. – Воп. 1. – Спр. 231.
12. Памяць: гіст.-дакум. хроніка Віцебска: у 2-х кн. Кн. 2 / рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БелЭН, 2003. – 680 с.
13. Памяць: гіст.-дакум. хроніка Полацка / рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БелЭН, 2002. – 912 с.
14. НАРБ, ф.4, воп.29, спр.111, л.43
15. Памяць Беларусі: рэспубліканская кніга / рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]; маст. У.П. Свентахоўскі. – Мінск: БелЭН, 2005. – 529с.: іл.
16. НАРБ. – Фонд 861. – Воп. 1. – Спр. 13. – Л. 5.
17. Рывкин, М. У последней черты / М. Рывкин, А. Шульман // Мишпоха. – 1998. – № 4.
18. Занальны дзяржаўны архіў у г. Полацку. – Фонд 750. – Воп. 1. – Спр. 1. – Л. 55а.
19. НАРБ. – Фонд 750. – Воп. 1. – Спр. 231. – Л. 23 – 25.
20. Памяць: Глыбоцкі раён: гіст.-дак. хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі / гал. рэд. Б.І. Сачанка [і інш.]. – Мінск: БелЭН, 1995. – 453 с.
21. Ботвинник, М. Памятники геноцида евреев Белоруссии / М. Ботвинник. – Мінск: Бел. навука, 2000. – 326 с.
22. Памяць: гіст.-дакум. хроніка Браслаўскага раёна. – Мінск: Паліграфафармленне, 1998. – 709 с.
23. НАРБ. – Фонд 845. – Воп. 1. – Спр. 64. – Л. 35 – 37.
24. НАРБ. – Фонд 845. – Воп. 1. – Спр. 63. – Л. 45.
25. ЗДА ў г. Полацку. – Фонд 687. – Воп. 1. – Спр. 1. – Л. 40.
26. Памяць: гіст.-дакум. хроніка Докшыцкага раёна: рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]; маст. Э.Э. Жакевіч. – Мінск: БелЭН, 2004. – 752 с.: іл.


*Паступіў 21.09.2006*